# НЕКАТОРЫЯ МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЛІТОЎСКАЙ МЕТРЫКІ

**А.А.Зайцава**

У Вялікім княстве Літоўскім старабеларуская мова выконвала функцыі дзяржаўнай мовы. Шырокай сферай выкарыстання беларускай мовы была канцылярска-юрыдычная дакументацыя. Шматлікія прыклады такой дакументацыі ўключае ў сабе Метрыка Вялікага княства Літоўскага.

Метрыка змяшчае ў сабе дакументы ад 14 да канца 18 ст. і мае вялікае значэнне для вывучэння гісторыі беларускай мовы.

У гэтым даследванні мы прааналізуем некаторыя моўныя асаблівасці "Літоўскай Метрыкі". Крыніцай даследвання паслужыў урывак з гэтага помніка, змешчаны ў "Хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы" (ч.1. – Мн., 1961г.). Пры гэтым выкарыстаны параўнальна-гістарычны метад.

*Графічныя сродкі*

1. у выкарыстанні графічных сродкаў для абазначэння гука [о] старабеларускія кніжнікі першапачаткова прытрымліваліся правіл, выпрацаваных у старарускую эпоху: у пачатку слоў звычайна пісалася Ѡ(амега), а ў іншых становішчах у слове – о.

**ѠБЫЧАᴹ ѠНИ ѠДНОМОУ ѠПЫТАТИ**

2. ужыванне літары ȣ(ук) з гукавым значэннем [у].

**ȣБИИСТВО ДРȣГИᴵ ПАШКОВȣЮ ȣ СВИСЛОЧИ**

3. ужыванне літары Ѳ(фіта) з гукавым значэннем [ф] ва ўласных іменах.

**ѲЕДОРА ЄЗОѲОВИᴵ**

4. ужыванне літары Є(у пачатку слоў і ў сярэдзіне пасля галосных; [э]); е (пасля мяккіх зычных; [э]).

**ЄСМО ТОЄ ПРИЄХАВШИ ЄЛОЗА ДЕЛА ИМЄᴴИ ВЫМЕНИЛИ**

5. ужыванне літар Ѧ(юс малы) (у сярэдзіне слоў пасля мяккіх зычных і на канцы слоў); Ꙗ(я) (у пачатку слоў ці ў сярэдзіне слоў пасля галосных).

**ИМѦ КЛѦЧОУ ПЬꙖНЫˣ РАСКАЗАНЫꙖ**

6. ужыванне Ъ і Ь

**РОᵀМИСТРЪ РАСКАЗАНЫꙖ БАТЬКОᴹ БЬЮᵀ**

7. традыцыйнае ўжыванне Ѣ(ять)

**НА МѢСТЕ ДѢЛО СОБѢ МНѢ**

8. аканне



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

ТАВАРЫШИ ВАДИТИ

9. ужыванне поўнагалосных форм

КОРОЛА ЗДОРО[в] ВОРОТЫ ВЫВОЛОКЛИ

*Марфалагічныя рысы.*

**1.** Ужыванне назоўнікаў:

– М.р. у форме Р.скл. адз.л. з канчаткамі -Оу -Ю:

СЛОуГОу КО[р]ЧМИ[т]КОу ГРОМЫКОу ДЕ[р]Ж[е]АЦОу ДЕЛОу;

– М.р. у форме Д.скл. адз.л. (адушаўлёныя) з канчаткамі -Оу -Ю:

ТАВАРИШОу ВЫСТОуПОу

– Ж.р. з асновай на І (і кароткае) у форме Т.скл. адз.л. з канчаткам -ЬЮ:

ШЕРСТЬЮ М[с]ЛТЬЮ;

– М.р. з асновай на -о (о кароткае) у форме М.скл. адз.л. з частковым ужываннем канчатка –е (В КРАКВЕ) і пануючым канчаткам –у (В ДОМОу);

– М.р. у форме Р.скл. мн.л. з канчаткамі –ОВЪ -ЕВЪ:

РОуБЛЕ[в] СВЪТѢКО[в]

– М.р. у форме Т.скл. мн.л. з канчаткамі: -ы -И

С ПОТОу[ж]НИКИ

**2.** Ужыванне займеннікаў, прыметнікаў і парадкавых лічэбнікаў:

– ужыванне энклітычных займеннікавых форм

МИ МА

– ужыванне поўных форм прыметнікаў и парадкавых лічэбнікаў

ТРОИЦКИИ ДРОуГИИ СЛОуЖЕБНЫИ КОТОРЫИ

– у Р.скл. з канчаткам –ОГО -ЕГО

БОБРОуИСКОГО БИТО[г] ДОБРО[г] СЛОуЖ[е]ЕНО[г]

– у Р.скл. ж.р. з канчаткам -ОЕ

ДО ДРОуГОЕ И[з]БЫ ДО ТОЕ КО[р]ЧМЫ

**3.** Ужыванне дзеясловаў:

– у 3 ас. адз.л. і мн.л. цяперашнягу часу толькі з мяккім канчаткам –ТЬ

СТОИТЬ БЬЮТЬ ВЕДЕТЬ БЬЕТЬ СПИТЬ

– адзіная форма прошлага часу – перфект, у 1, 3 ас. адз.л. – звязка ЕСМИ, у 1 ас. мн.л. – звязка *ЕСМО*

*ДА[л] ЕСМИ ЕСМИ НѢ ВЕДАЛА НЕ СМЕЛА ЕСМИ*

– у 3 ас. мн.л. – без звязкі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*ѠНИ ПОБИЛИ ЖАЛОВАЛИ ТЫ[И] МЄЩАНЄ*

– інфінітыў на –ТИ

**БИТИ, ВАДИТИ**

Такім чынам, паказаны фактычны матэрыял у прааналізаваным помніку ў дастаткова высокай ступені адлюстроўвае рысы беларускай мовы на ўсіх узроўнях: графічным, правапісным, марфалагічным. Гэта сведчыць аб тым, што аўтары “Літоўскай Метрыкі” знаходзіліся пад уплывам жывога народнага маўлення, што з’яўляецца характэрным для дзелавых помнікаў таго часу.